ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Настаўніцкая газета
28 студзеня 2010 года

# БДАТУ таксама сустракаў гасцей з Усходу

Моцныя беларускія маразы не збянтэжылі гасцей з далёкага сонечнага Туркменістана. Падзяліцца вопытам і намеціць шляхі супрацоўніцтва з Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэтам была заклікана сустрэча рэктараў Туркменскага сельскагаспадарчага ўніверсітэта імя С.Ніязава і Туркменскага політэхнічнага інстытута з кіраўніцтвам БДАТУ. Суправаджаў замежную дэлегацыю намеснік Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Барыс Васільевіч Іваноў.

Госці наведалі вучэбныя аўдыторыі і лабараторыі ўніверсітэта, азнаёміліся з бібліятэкай і музеем гісторыі. Сёння ў БДАТУ вучыцца 79 студэнтаў з Туркменістана. Яны спасцігаюць азы ўніверсітэцкай навукі і актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці ВНУ: мастацкая самадзейнасць і спартыўныя спаборніцтвы, экскурсіі і творчыя сустрэчы не абыходзяцца без удзелу студэнтаў з Туркменістана.

Безумоўна, сустрэча рэктараў туркменскіх ВНУ з калектывам БДАТУ дазволіць пашырыць межы міжнароднага супрацоўніцтва, умацуе дружбу паміж туркменскімі і беларускімі студэнтамі.

Алена КРУЖАЛАВА.